Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-01-04

# Факсімілія да 500-годдзя

***Напрыканцы снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася цырымонія запуску праекта факсімільнага выдання кніжнай спадчыны Францыска Скарыны. Мерапрыемства складалася з падпісання ў друк першага тома поўнага збору працаў беларускага і ўсходнееўрапейскага першадрукара і прэс-канферэнцыі з гэтай нагоды.***

Выдавецкі праект разлічаны на 2013–2017 гг. і прымеркаваны да 500-годдзя айчыннага кнігадрукавання. Ініцыятарамі і асноўнымі выканаўцамі праекта з'яўляюцца НББ і ААТ «Банк Бел-ВЭБ», а гэта яшчэ адзін прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў нашай краіне.

Шматтомнае факсімільнае выданне ўпершыню дазволіць сабраць поўны рэпертуар кніг, надрукаваных Ф. Скарынам у Празе (1517–1519) і Вільні (1522–1525). У яго аснову пакладзены электронныя копіі найлепшых захаваных кніг першадрукара, якія знаходзяцца ў бібліятэках і музеях Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і іншых краінаў. Факсімільнае выданне з максімальнай паўнатой узнаўляе кнігі Ф. Скарыны з захаваннем структуры, зместу, асаблівасцяў шрыфтоў і гравюраў арыгінальных выданняў, а таксама перадае ўсе адметнасці, набытыя імі на працягу 500-гадовага бытавання.

Для забеспячэння навуковага суправаджэння праграмы задзейнічаны супрацоўнікі НББ, Нацыянальнай акадэміі навук і замежныя эксперты. Усе выданні падмацаваныя каментарамі навукоўцаў, а таксама перакладамі прадмоваў і пасляслоўяў Ф. Скарыны на беларускую, рускую і англійскую мовы.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*

"Краязнаўчая газета". Факсімілія да 500-годдзя